**30 студзеня 2024 года - 160 гадоў з дня нараджэння Марыя Радзевіч (1864-1944), польскай пісьменніцы і навеліcткі, якая большую частку жыцця правяла ў маёнтку Грушава Кобрынскага павета**



**Марыя Радзевіч (Радзевічуўна)** - польская пісьменніца і навелістка, аўтар больш за 30 аповесцей і навел, прысвечаных жыццю палескай шляхты і сялянства, прыродзе і побыту простых людзей, а таксама настальгічнаму патрыятызму, ідэалізацыі патрыярхальнага мінулага. Большую частку жыцця (з 1881 года па 1939 год) М. Радзевіч правяла ў маёнтку Грушава Кобрынскага павета, дзе пісала свае творы, якія друкаваліся ў Варшаве. На Кобрыншчыне знаходзяцца магілы самых родных Марыі людзей: дзядулі, бабулі, бацькоў, дзядзькі, сястры. Таму мы смела можам лічыць яе сваёй зямлячкай.

Марыя Радзевіч нарадзілася 30 студзеня 1864 года ў маёнтку Пянюга Ваўкавыскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Зэльвенскага раёна) у сям'і памешчыка Генрыха Радзевіча і Амеліі Кужанецкай з Ордаў. Бацькі Марыі за дапамогу ўдзельнікам паўстання 1863 года, якая выявілася ў захоўваннні зброі, былі сасланыя ў Сібір, а маёнтак канфіскаваны. Маці дазволілі нарадзіць дачку дома, а праз месяц таксама адправілі ў Сібір. Марыя была аддадзена пад апеку Караліны Скірмунт з вядомага роду Скірмунтаў. У 1871 годзе Генрых і Амелія вяртаюцца з Сібіры. Але былым паўстанцам забаранілі жыць на Бацькаўшчыне, і сям'я чатыры гады шукала прытулку ў Варшаве. Адукацыю Марыя атрымала ў пансіянаце Кучынскай у Варшаве і ў Язлоўцах ў пансіянаце ў манашак. Выхоўвалася ў рэлігійна-патрыятычнай атмасферы, што наклала адбітак на ўсё яе жыццё.

У 1875 годзе памірае брат бацькі Тэадор Радзевіч, які валодаў маёнткам Грушава на Кобрыншчыне, набытым Радзевічамі ў 1825 годзе. Атрымаўшы спадчыну, сюды і пераехалі Генрых і Амелія Радзевічы. Так будучая пісьменніца апынулася ў Грушаве. У 1881 годзе Марыя страціла бацьку, а неўзабаве памерла маці. З 1887 года яна ўзяла кіраўніцтва гаспадаркай у свае рукі, стала гаспадыняй маёнтка, у якім пражыла да 1939 года. Дарэчы, Марыя Радзевіч была апошняй уладальніцай маёнтка Грушава.

Так як Марыя працяглы час жыла ў Грушаве, пакідаючы яго на кароткі тэрмін, то можна гаварыць пра выключную ролю Палесся ў жыцці пісьменніцы. Тут фарміраваліся яе ідэалы, тут выспяваў талент пісьменніцы, клалася на паперу большасць яе твораў, разгортвалася яе грамадская, рэлігійная, гаспадарчая дзейнасць. Талент пісьменніцы фарміраваўся пад уплывам прыроды і фальклору Палесся, светаадчування палешукоў.

У 18-гадовым узросце Марыя Радзевіч упершыню паспрабавала сябе ў літаратурнай дзейнасці. У 1882 годзе пад псеўданімам Маро былі надрукаваны дзве навелы ў адным з варшаўскіх часопісаў. Сапраўдная папулярнасць прыйшла да Марыі пасля перамогі ў літаратурным конкурсе часопіса «Swit». На конкурс быў прадстаўлены раман «Страшны дзядок».

У 1888 годзе М. Радзевіч напісала аповесць «Дзевайціс», якая адразу прынесла ёй пэўную вядомасць як адной з папулярных польскамоўных пісьменніц. «Dewajtis’» у перакладзе азначае «Боскі». Так называўся вялікі дуб Грушаўскага маёнтка, на лаўцы пад якім любіла сядзець Марыя ў абдымках маці. Цяпер гэтаму дрэву больш за 500 гадоў, яно перанесла ўсе нягоды, дасягнуўшы вышыні 26 метраў і дыяметра 165 сантыметраў.

Марыя Радзевіч добра ведала край, дзе ёй наканавана было жыць, ведала і любіла яго. Уражлівая душа Марыі прагна ўбірала ў сябе хараство палескіх мелодый. Краявіды Палесся, яго жывёльны і раслінны свет знайшлі мастацкае асэнсаванне ў многіх творах пісьменніцы. Яна ўсёй душой палюбіла гэты таямнічы «край пушчаў і багнаў».

У аповесці «Пажары і папялішчы» (1893) Марыя Радзевіч упершыню звярнулася да беларускай тэматыкі: паказала цяжкі лёс сялян-палешукоў. У 1895 годзе ў апавяданні «З глушы» пісьменніца прадоўжыла тэму жыцця беларускага сялянства, да якога заўсёды ставілася са спачуваннем. У гэты перыяд сваёй творчасці пісьменніца арыентавалася на літаратурныя здабыткі Элізы Ажэшкі, брала з яе прыклад. У пачатку ХХ стагоддзя напісаны раман «Верас» (1903), аповесці «Маці» (1904), «Былі і будуць» (1908). У 1931 годзе напісаны раман «Гняздо Белазора». У 1934 годзе атрымала літаратурную прэмію імя Элізы Ажэшкі, у 1935 годзе — прэмію Польскай літаратурнай акадэміі.

Марыя Радзевіч па гістарычных звестках і ўспамінах мясцовых жыхароў шмат займалася дабрачыннасцю. У маёнтку арганізавала польскую школу. Уласны лес, які так любіла і берагла, адпускала вайскоўцам-пагарэльцам бясплатна, на грамадскія патрэбы вылучала частку сродкаў з літаратурных ганарараў. Прымала актыўны ўдзел у вяртанні касцёла католікам у в. Гарадзец, давала сродкі на рамонт храма. На сродкі пісьменніцы быў пабудаваны другі паверх польскай гімназіі (будынак сучаснай школы № 1 г. Кобрына). У 1939 годзе з яе ўдзелам быў пабудаваны касцёл у Антопалі.

У перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі разам з вернай сяброўкай Ядвігай Скірмунт жыла ў Варшаве. У 1944 годзе эвакуіравалася са сталіцы і пасялілася ў мястэчку Жалязова Воля, што паблізу Сахачава (Польшча).

Памерла Марыя Радзевіч 16 лістапада 1944 года. Пахавана на Алеі заслужаных людзей Польшчы на Павонзках (Варшава).

Пасля таго, як М. Радзевіч выехала ў Варшаву, дом у Грушаве быў перададзены ў распараджэнне мясцовых улад. У 1970-1980-я гады ў ім размяшчаліся медыцынскі пункт, магазіны і рабочая сталовая. На тэрыторыі былога маёнтка быў узведзены двухпавярховы будынак, у якім спачатку знаходзілася кантора, а затым базавая школа. Старадаўні маёнтак Грушава з яго знакамітым дубам стаў месцам для жывапісных пленэраў «Грушаўскія замалёўкі». Увосень 2010 года кобрынскія мастакі арганізаваліся ў творчае аб′яднанне «Галерэя “Дэвайціс”».

Марыя Радзевіч засталася ў памяці старажылаў-землякоў як добрая памешчыца, якая нават даравала сваім сялянам крадзяжы і іншыя правіннасці. Вельмі любіла простых сялян, «у руках якіх работа кіпела». Яна нават стала для некаторых мясцовых дзяцей хроснай. Адна з яе хросніц Ганна Лаўрэнцьеўна Калеснікава нейкі час працавала бібліятэкарам у Грушаўскай сельскай бібліятэцы.

У 1994 годзе польскія прыхільнікі яе таленту ў гонар 130-годдзя з дня нараджэння ў былым маёнтку Радзевічаў пад дубам Дзевайцісам узвялі сціплы памятны знак з надпісамі на беларускай і польскай мовах са словамі падзякі Марыі Радзевіч. Гэты памятны знак устаноўлены пад дубам «Дзевайцісам».

Жыхары Грушава, Гарадца не толькі памятаюць пісьменніцу, але і ганарацца тым, што яна жыла побач з імі,

берагуць рэчы, прадметы, да якіх дакраналіся яе рукі. У Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы ёсць кнігі Марыі Радзевіч на польскай мове «Czahary», «Na wyżynach», «Na fali».

Матэрыял падрыхтаваны ў 2024 г. Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна,
бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі.

## Аб жыцці і дзейнасці М. Радзевіч


**Мальдзіс, А. В.** Радзевіч Марыя / А. В. Мальдзіс // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 2001. - Т. 13. – С. 208.

**Мальдзіс, А. В.** Радзевіч Марыя / А. В. Мальдзіс // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. - Мінск, 1986. - Т. 4. - С. 449.

**Грушаўская** сядзіба // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. - Мінск, 2012. - Т. 3. - С. 277.

**Бахановіч, Н. Л.** Беларуская тэма ў польскай літаратуры : [творчасць Ю. У. Нямцэвіча, А. Міцкевіча, М. Радзевіч, С. Пясецкага] / Н. Л. Бахановіч // Літаратурная карта Еўропы : кантакты, тыпалогія, інтэртэкстуальнасць. - Мінск, 2012. – С. 205—228.

**Ващукувна-Каменецка, Д**. [Мария Родевич] / Данута Ващукувна-Каменецка // Брест – город незабываемый / Данута Ващукувна-Каменецка. - Брест, 2000. - С. 51-54.

**Дуб** черешчатый в деревне Грушево / [И. П. Вознячук и др.] // Живые памятники: редкие и уникальные деревья и насаждения Беларуси. - Минск, 2021. – С. 128—129.

**Зборнік** навуковых матэрыялаў, прысвечаных 75-годдзю і 130-годдзю з дня нараджэння Івана Мележа і Марыі Радзевіч / Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт, Філалагічны факультэт. – Брэст, 1999. – 123 с.

**Ильин, А.** Общественно-политическая, хозяйственная и религиозно-культурная деятельность на Полесье Марии Родзевич и Генрика Скирмунта / Александр Ильин // Род Скірмунтаў і Палессе ў эпоху сацыяльнай і нацыянальнай трансфармацыі грамадства гістарычнай Літвы. XIX–XX стст. : [зборнік]. - Мінск, 2019. - С. 154–171.

**Калеснік, У.** Зорны спеў : літаратурныя партрэты, нарысы, артыкулы / Уладзімір Калеснік. – Мінск, 1975. – 400 с.

Гл. на с. 8–10.

**Калинин, М. Ю.** Описание усадеб. Грушево / М. Ю. Калинин // Природные ресурсы и охрана окружающей среды Кобринского района / М. Ю. Калинин. - Минск, 2009. - С. 15-17.

**Кивака, Е. Г.** Жанровые особенности новелистики М. Родзевич / Е. Г. Кивака // Материалы конференции, посвящённой 130-летию со дня рождения Марии Родзевич. - Брест, 1994.

**Кобринский** район. Усадьба Марии Родзевич // 100 достопримечательностей Брестчины. - Брест, 2019. – С. 44 : фат.

**Ляшук, В. Я**. Марыя Радзевіч / В. Я Ляшук, Г. М. Снітко // Літаратурная Берасцейшчына. - Мінск, 2008. - С. 13,126-136,143, 220.

**Ляшук, В. Я**. Польскамоўныя пісьменнікі. Марыя Радзевіч / В. Я Ляшук, Г. М. Снітко // Літаратура Берасцейшчыны. - Брэст, 1999. - С. 143-156.

**Мешечко, Е. Н.** Радзевич Мария / Е. Н. Мешечко // Путешествие по Беларуси. В краю Немана, Западного Буга и Припяти / Е. Н. Мешечко. - Брест, 2012. – С. 238.

**Несцярчук, Л. М.** Грушава / Л. М. Несцярчук // Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X-XX ст. (гісторыя, стан, перспектывы). - Мінск, 2002. - С. 190-191.

Пра мемарыяльны палацава-паркавы ансамбль, сядзібу знакамітай пісьменніцы Марыі Радзевічуўны (Радзевіч) і гісторыю яе сям'і.

**Панасюк, Н**. Сувязь Марыі Радзевіч з Беларуссю і беларускай культурай / Надзея Панасюк // Acta Albaruthenica : навуковы зборнік. - Мінск, 2005. - Вып. 5. - С. 99-103.

**Радзевіч Марыя** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 65. (Лёсам звязаны з Кобрыншчынай).

**Радзевіч Марыя** // Памяць. Зэльвенскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2003. - С. 421.

**Радзевіч Марыя** // Гісторыка-культурная спадчына Брэсцка-Пінскага Палесся: паміж мінулым і будучыняй : зборнік матэрыялаў навуковай канферэнцыі 28–29 верасня 2005 г. : у 2 ч. - Брэст, 2006. – Ч. 2. - С. 71-78.

**Род** Скірмунтаў і Палессе ў эпоху сацыяльнай і нацыянальнай трансфармацыі грамадства гістарычнай Літвы. XIX–XX стст. = Rod Skirmuntow i Polesie w epoce przemian spolecznych i narodowych na ziemiach historycznej Litwy. XIX-XX ww. : [зборнік / А. Смалянчук і інш.]. - Мінск, 2019. - С. 154-171.

**Симонова, И**. Пани на Грушево / Ирина Симонова // Карані і кроны : гісторыя Кобрыншчыны: першая палова XX стагоддзя. - Брэст, 2017. - С. 20-35.

**Федорук, А. Т.** Грушево / А. Т. Федорук // Старинные усадьбы Берестейщины / А. Т. Федорук. - Минск, 2004. –
С. 355-359.

Из истории усадебного дома Родзевичей и М. Радзевич.

**Чыгрын, С**. Зэльвенскія карані / С. Чыгрын // Краязнаўчымі сцежкамі Зэльвеншчыны: артыкулы, гутаркі / Сяргей Чыгрын. - Мінск, 2013. - С. 29—33.

**160 гадоў** з дня нараджэння М. Радзевіч (1864-1944) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская РЦБС, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С. 131.

**Чыгрын, С**. Марыя Радзевіч не любіла чужых хваляванняў / Сяргей Чыгрын // Літаратура і мастацтва. - 2021. - 11 чэрвеня (№ 23). - С. 10 : фат.

**Усадьба** классика польской литературы Марии Родзевич в д. Грушево // Вечерний Брест. - 2014. - 15 августа. - С. 11.

**Жук, Е.** Там, где дуб Девайтис шумит... / Елена Жук // Вечерний Брест. - 2012. - 18 июля. - С. 7.

**Китайчук, М.** Мария Родзевич / Мечислав Китайчук // Кобрин-информ. - 2007. –5 июля, 7 июля.

**Мальдзіс, А.** Літаратурныя мясціны Беларусі. Краязнаўчы даведнік / А. Мальдзіс // Маладасць. – 2007. - № 11. – С. 128–129.

**Борисюк, Ю. А.** И старый парк хранит воспоминанья / Ю. А. Борисюк // Кобрин-информ. – 2002. – 18 апреля. – С. 1.

**Сенькавец, У**. Марыя Радзевіч / У. Сенькавец // Заря. – 1996. – 11 июня.

**Барысюк, У.** Навуковы форум – у верасні / У. Барысюк // Народная трыбуна. - 1995. - 24 чэрвеня.

Брэсцкі педінстытут у верасні праводзіць міжнародную канферэнцыю "Прырода і людзі Палесся ў творчасці Марыі Радзевіч і яе сучаснікаў.

**Ляшук, В.** Марыя Радзевіч і Палессе / В. Ляшук // Народная трыбуна. - 1995. - 15 красавіка

**Ляшук, В.** Місіянерка з Грушава / В. Ляшук // Народная трыбуна. – 1995. – 5 жніўня.

Аб ролі Марыі Радзевіч у літаратурным і палітычным жыцці Палесся.

**Мухавецкі, Л.** Там, дзе жыла пані Марыя / Л. Мухавецкі // Свабода. – 1994. – 3 жніўня. – С. 3.

У в. Грушава адбылося адкрыццё памятнай дошкі ў гонар польскай пісьменніцы М. Радзевіч.

**Сущук, А.** Так хотела дождаться… : [повесть о Марие Родевич] / А. Сущук // Кобрынскі веснік. - 1994. - 18 чэрвеня, 22 чэрвеня, 25 чэрвеня.

**Сушчук, А.** У фондах не значыцца / А. Сушчук // Звязда. - 1993. - 6 студзеня. - С. 3.

У в. Грушава жыла польская пісьменніца М. Радзевіч.

**Сушчук, А.** Марыя Радзевічуўна : старонкі нашай гісторыі / А. Сушчук // Кобрынскі веснік. - 1992. - 9 верасня. - С. 2, 3.

**Сущук, А.** Кто она, Мария Радзевичувна? / А. Сущук // Заря. – 1992. – 15 сентября. – С. 3.

**Кобрынскі раён**
**Грушава**
**Радзевіч Марыя**
**Пісьменнікі**